Источник: "Веды" - 2012-06-11

# ВЕЧАР У ПАРКУ МРОЯЎ



**Акурат у еўрапейскі Дзень паркаў, які адзначаўся 24 мая, Малая зала імя Р.Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі прымала цікавых гасцей. Польскі інстытут у Мінску сумесна з музычным ансамблем салістаў «Класік-авангард» пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Уладзіміра Байдава, а таксама пры ўдзеле танцавальнага гурта «Гісторыка» і школы старадаўняга танца «Залаты двор» арганізавалі музычна-паэтычную вандроўку «Праменад у парку мрояў». Да гэтага мерапрыемства была прымеркавана выязная выстава «Старадаўнія паркі Беларусі», падрыхтаваная аддзелам рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа НАН Беларусі.**

Сярод гасцей выставы былі дырэктар Польскага інстытута Пётр Казакевіч, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Францыі ў Рэспубліцы Беларусь Мішэль Рэнэры, дзеячы навукі і культуры, выкладчыкі мінскіх вну, студэнты, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Выставу прадстаўляла навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі Алена Дзенісенка. Прадэманстраваныя ў экспазіцыі дакументы выклікалі вялікую цікавасць у гасцей. Самае ранняе выданне – адзін з 19 тамоў, зроблены ў друкарні М.Вольфа ў 70-х гадах XIX стагоддзя, – «Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении» (1882). Гэты том уключае звесткі аб Літоўскім і Беларускім Палессі, і менавіта ён выклікаў асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выставы.

Варта адзначыць даследаванні А.Фядарука ў кнігах «Старинные парки Белоруссии», «Старинные усадьбы Минского края», «Садово-парковое искусство Белоруссии». Не менш зацікаўлены госці былі і альбомам Л.Несцерчука, у якім дадзены замалёўкі населеных пунктаў нашай краіны.

Акрамя гэтага ў экспазіцыі было прадстаўлена прыжыццёвае выданне мемуарыста, мастака Э.Паўловіча «Новогрудок в XIX в.» (1902), таксама даследаванне педагога, гісторыка, музейнага работніка і краязнаўца У.Краснянскага – яго прыжыццёвае выданне «Город Мстиславль (Могилёвской губернии) с 50 автотипиями» (1912).

На выставе экспанаваліся альбомы з рэпрадукцыямі архітэктурна-паркавых ансамбляў Магілёва, Гомеля, Гродна, Мірскага замка, Слоніма, Несвіжа ды інш.

Арганізацыя падобных выстаў – важная падзея для сучаснасці: яна паказвае тое, чым мы павінны ганарыцца, што належыць беражліва захоўваць і аб чым трэба клапаціцца. Бо менавіта культурнае багацце робіць нас сапраўднымі свядомымі беларусамі, наследнікамі цудоўнай зямлі знакамітых продкаў.

**Анэлія ЛАПКОЎСКАЯ**
**Фота А. Дзенісенка**